# *Чорная бяроза*



***На тэрыторыі Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка “Ліпічанская пушча” знаходзіцца ўнікальная група дрэў: на ўскраіне невялікага балотца, блізка адно ад другога растуць алешына, ясень, белая і чорная бярозы. Чорная бяроза ўвогуле вельмі рэдка сустракаецца ў нашых лясах, яна занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі. У Ліпічанскай пушчы іх зафіксавана ўсяго шэсць. Аб гэтым дзіўным месцы пушчанскія жыхары прыдумалі прыгожую легенду. Калісьці ў вёсцы жыла маці з дочкамі: адна была бялявая, а другая - чарнявая. Пакахалі сёстры хлопца з суседняй вёскі. І той таксама моцна закахаўся ў абедзвюх і не мог выбраць, якая з іх бляжэй яго сэрцу. Прызначаў ён ім абодвум спатканні на беразе невялікага балотца за вёскай. Аднойчы здарылася так, што абедзве сястры адначасова прыйшлі на спатканне і абман раскрыўся. Ад болю сталі яны абедзве бярозамі: адна белай, а другая чорнай. Даведалася пра гэта маці - прыйшла на бераг балота, доўга плакала па дочках, пакуль не стала побач з імі алешынай. І***



***хлопец не змог перажыць страту, ператварыўся ў ясень. І сення ён стаіць ля балотца крыху ў баку ад трох пераплеценых галінамі дрэў - алешыны і дзвюх бяроз.***